# УСЕ ГРАНІ МАЙСТЭРСТВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Безумоўна, вялікае значэнне для павышэння прэстыжу той ці іншай прафесіі мае ўзровень заробкаў яе прадстаўнікоў, але аплата працы педагогаў дашкольнай адукацыі — сфера дзейнасці ўрада, а не наша. Разам з тым мы можам зрабіць тое, што ў нашых сілах — паказаць крэатыўнасць педагагічнай працы, яе выключную важнасць, магчымасць непасрэдна ўплываць на будучае пакаленне. Вы думаеце, гэта лёгка — быць заўсёды цікавым дзецям? Таксама сярод навінак — «візуальны мерчандайзінг», «хлебапячэнне», «аграномія», «эксплуатацыя сельскагаспадарчых машын».

Па-трэцяе, упершыню ў нацыянальным чэмпіянаце ў рамках секцыі Deaf Skills будуць выступаць удзельнікі з парушэннямі слыху: не толькі навучэнцы ўстаноў адукацыі, але і маладыя рабочыя.

## Нацыянальная спецыфіка

***— Беларусь — усё ж такі адносна новы ўдзельнік руху WorldSkills: мы далучыліся да яго толькі чатыры гады таму. Наколькі ўзровень складанасці конкурсных практычных заданняў, крытэрыі ацэньвання, сама арганізацыя спаборніцтваў на нашым чэмпіянаце будуць набліжаны да стандартаў WorldSkills International?***

— Размова ідзе пра самы прэстыжны ў свеце конкурс прафесійнага майстэрства. Спаборніцтвы праводзяцца кожныя два гады ў міжнародным фармаце на працягу ўжо больш як 60 гадоў. На сённяшні дзень асацыяцыя WorldSkills International аб'ядноўвае 77 краін-удзельніц, дзе пражывае больш за 70 працэнтаў насельніцтва зямнога шара. Адкуль такая вялікая цікавасць у свеце да руху WorldSkills? Усё вельмі проста: таму што прафесійныя стандарты WorldSkills — гэта стандарты заўтрашняга дня. Заданні на міжнародных чэмпіянатах з'яўляюцца па сутнасці адлюстраваннем тых найноўшых тэхналогій, што ўкараняюцца ў рэальны сектар эканомікі і фарміруюцца экспертамі з усяго свету ў канкрэтнай кампетэнцыі. Апошнія гады своеасаблівым лакмусам для ўсіх з'яўляюцца краіны Заходняй Еўропы, Карэя, Японія, Кітай, а ўсе іншыя спрабуюць ад іх не адстаць. Калі мы рыхтуемся да міжнародных чэмпіянатаў, то таксама параўноўваем змест конкурсных заданняў з сістэмай падрыхтоўкі кадраў у нашай краіне і бачым, якія элементы нам трэба ўдасканальваць. Напрыклад, слесар-сантэхнік — масавая прафесія, прадстаўнікі якой запатрабаваныя як пры ўзвядзенні будынкаў, так і пры эксплуатацыі ў ЖКГ, прычым і ў малым, і ў сярэднім бізнесе. Аналіз рынку працы паказаў, што, напрыклад, больш за 50 працэнтаў прадпрыемстваў будаўнічага комплексу маюць прыватную форму ўласнасці і адносна невялікую штатную колькасць — да 300 чалавек. Ёсць яшчэ адзін важны сегмент — індывідуальная занятасць. Па стандартах WorldSkills слесар-сантэхнік павінен выконваць не толькі асобныя віды работ — гэтыя ўменні стаяць далёка не на першым плане. Ён атрымлівае ўмоўны заказ — змантаваць у доме сантэхнічную сістэму: яму трэба спраектаваць размяшчэнне ўсіх элементаў (радыятараў, змяшальнікаў, душавой кабіны, пральнай машыны і гэтак далей), затым па складзеным праекце заказаць усе віды матэрыялаў і толькі пасля гэтага перайсці да выканання работ. Гэта значыць, што на першы план выходзіць планіровачная функцыя, а мы ёй не навучаем у нашых установах адукацыі.



На 44-м Сусветным першынстве WorldSkills Abu Dhabi 2017.

Улічваючы членства Рэспублікі Беларусь у WorldSkills International, узровень складанасці нашых конкурсных практычных заданняў, крытэрыі ацэньвання і сама арганізацыя спаборніцтваў максімальна прыбліжаны да стандартаў WorldSkills. Каб зразумець, наколькі кампетэнцыі, якімі валодаюць навучэнцы і выпускнікі нашых устаноў адукацыі, адпавядаюць сусветным стандартам падрыхтоўкі спецыялістаў, мы павінны выкарыстоўваць міжнародныя індыкатары якасці. І сёння мы маем ужо вялікую групу ўласных нацыянальных экспертаў: з 37 такіх спецыялістаў 29 маюць міжнароднае прызнанне і акрэдытацыю, паколькі валодаюць веданнем стандартаў і рэгламентаў WorldSkills International.

Але ў розных краінах ёсць свае нюансы. Напрыклад, для нас не актуальныя тэхналогіі, звязаныя з марскім і авіяцыйным транспартам ці космасам. Затое мы ўвялі такую кампетэнцыю як «эксплуатацыя сельскагаспадарчых машын», паколькі шэраг навучальных устаноў у рэгіёнах рыхтуюць тых жа механізатараў, кіроўцаў-трактарыстаў, слесараў па рамонце і абслугоўванні сельскагаспадарчай тэхнікі. Мінскі трактарны завод выдзеліў для канкурсантаў самыя сучасныя трактары, на якіх можна не толькі выконваць конкурсныя заданні, але і дэманстраваць усім, наколькі змяніўся гэты від дзейнасці. Кампанент WorldSkills Belarus уключае, акрамя «дашкольнай адукацыі» і «эксплуатацыі сельскагаспадарчых машын», таксама «аграномію», «геадэзію» і «дахавыя работы». Усе кампетэнцыі адпавядаюць відам дзейнасці, якія прадстаўлены на нашым рынку працы.

## Рывок наперад

***— Валерый Мікалаевіч, мы традыцыйна ганарымся сваёй сістэмай прафтэхадукацыі, якую не разбурылі, як гэта адбылося ў многіх іншых краінах на постсавецкай прасторы. Аднак на апошнім чэмпіянаце свету ў Абу-Дабі канкурыраваць на роўных з тымі ж расіянамі мы не змаглі...***

— Давайце будзем параўноўваць нашы дасягненні ў Абу-Дабі з вынікамі ўдзелу ў Сан-Паўлу. Чэмпіянат у Бразіліі ў 2015 годзе быў першай нашай спробай выступлення на спаборніцтвах такога ўзроўню. Беларуская зборная ў складзе 17 чалавек выступала ў 15 кампетэнцыях. І нашы дзяўчаты заваявалі два медалі выдатніка. Летась у Абу-Дабі беларуская зборная выступала ўжо па 27 кампетэнцыях у шасці прафесійных кірунках. А ўвогуле ў чэмпіянаце ўдзельнічала больш за 1200 канкурсантаў з 59 краін. У агульнакамандным рэйтынгу, у якім былі адзначаны 57 краін-удзельніц, Беларусь заняла 16-е месца, а ў Бразіліі ў 2015 годзе — 36-е месца. Няўжо гэта дрэнны вынік? Праўда, медаль выдатніка ў нас быў толькі адзін — у намінацыі «цырульніцкае мастацтва» яго заваявала выпускніца Брэсцкага дзяржаўнага каледжа сферы абслугоўвання Надзея Кашчэлян. Але ж і патрабаванні да ўдзельнікаў спаборніцтваў істотна ўзраслі: каб заваяваць медаль выдатніка, неабходна было набраць у асабістым заліку 700 балаў, тады як у Бразіліі ў 2015-м — толькі 500. Большасць удзельнікаў беларускай каманды атрымалі звыш 650 балаў, прычым аднаму з іх да пераможнага медаля не хапіла ўсяго трох балаў.

Я хачу заўважыць, што канкурэнцыя сур'ёзна ўзмацняецца, таму і планку патрабаванняў арганізатары істотна павысілі. А ў поспеху расіян ёсць шмат тлумачэнняў. Расійская зборная, якая ўзяла першае месца ў агульнакамандным заліку, дабілася гэтага выніку не толькі якасцю, але і колькасцю: іх удзельнікі былі прадстаўлены практычна ва ўсіх кампетэнцыях. Беларусь не можа сабе гэта дазволіць, да і не трэба гэта нам, бо многіх відаў дзейнасці на нашым рынку працы проста няма.

***— А якія механізмы фінансавання руху WorldSkills у нас дзейнічаюць?***

— Да апошняга часу сродкі з дзяржаўнага бюджэту на гэты кірунак былі задзейнічаны часткова. У большай меры фінансаванне адбывалася за кошт пазабюджэтных рэсурсаў РІПА, устаноў прафесійнай адукацыі, рэгіянальных структур, некаторых прадпрыемстваў і арганізацый. Гэтых сродкаў, безумоўна, не хапала для поўнамаштабнага развіцця руху WorldSkills у нашай краіне. І прэм'ер-міністр даў даручэнне, каб у Дзяржаўную праграму «Адукацыя і маладзёжная палітыка» быў унесены асобны раздзел па фінансаванні, які прадугледжваў бы накіраванне мэтавых сродкаў на развіццё руху WorldSkills у Беларусі і непасрэдна на стажыроўкі ўдзельнікаў нацыянальных і міжнародных конкурсаў прафесійнага майстэрства і іх педагогаў.

## Нескарацечная выгада

***— У сусветнага руху WorldSkills ёсць дэвіз «Удасканальвай свет прафесійнымі навыкамі». Падчас апошняй нашай сустрэчы вы казалі, што і руху WorldSkills Belarus патрабуецца ўласны брэнд, так бы мовіць, перазагрузка паняцця «рабочая прафесія»...***

— У пачатку года ў Магілёве, які быў абраны на 2018 год маладзёжнай сталіцай Беларусі, стартаваў праект «WorldSkills — старт у будучыню!». Ён уключае шэраг цікавых мерапрыемстваў: конкурс праектаў «Профі-ІМІДЖ», прома-ролікаў — «Прафесія — новы фармат», конкурс па стварэнні гімна WorldSkills Belarus і іншыя. А, напрыклад, у рамках конкурсу «Pro-рух» будуць вызначаны пераможцы ў дзвюх намінацыях: «Слоган руху WorldSkills Belarus» і «Сімвал руху WorldSkills Belarus». Абмеркаванне найлепшых ідэй мы арганізуем у інтэрнэце.

***— Дык усё ж на каго ў першую чаргу разлічаны нацыянальны чэмпіянат? І каму яго будзе цікава наведаць?***

— Спаборніцтвы праводзяцца не дзеля саміх спаборніцтваў. Іх фармат выкарыстоўваецца для таго, каб павысіць прэстыж рабочых прафесій сярод моладзі і спрыяць распаўсюджванню ў свеце міжнародных прафесійных стандартаў. Працадаўцы павінны быць у шчыльнай сувязі з тым, хто рыхтуе для іх кадры, удзельнічаць у фарміраванні матэрыяльна-тэхнічнай базы і фінансаванні ўстаноў адукацыі. Для таго каб выпускаць канкурэнтаздольную на знешніх рынках прадукцыю, патрабуюцца не толькі сучасныя тэхналогіі, але і спецыялісты самай высокай кваліфікацыі, якія змогуць працаваць на сучасным абсталяванні. Нацыянальны чэмпіянат — гэта і дэманстрацыя найноўшых тэхналогій на вытворчасці і ў рэальным сектары эканомікі. Ужо на этапе адбору абсталявання да чэмпіянату прадпрыемствы знаёміліся з тэхнічнымі заданнямі, якія адпавядаюць міжнародным стандартам, і адкрывалі шляхі ўдасканалення сваёй дзейнасці. Я хачу заўважыць, што выгада для эканомікі краіны ад WorldSkills не скарацечная.

На асобнай пляцоўцы будзе праходзіць конкурс сярод выхаванцаў устаноў дадатковай адукацыі JuniorSkills у дзвюх узроставых групах: 10—13 і 14—17 гадоў. Дзеці і падлеткі спаборнічаюць у такіх кампетэнцыях, як «мабільная робататэхніка», «беспілотныя лятальныя апараты», «графічны дызайн», «інжынерны дызайн CAD», «нейратэхналогіі» і іншых. Гэта тыя сферы, якія будуць драйверамі развіцця эканомікі ў наступныя дзесяцігоддзі, таму так важна абудзіць у падрастаючага пакалення цікавасць да іх. Чакаем 120 канкурсантаў. Таму сумна дакладна не будзе.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Ведай нашых!

### Перамогі з прыцэлам на будучыню

**Беларусы заваявалі 24 медалі на Сусветнай летняй гімназіядзе ў Марока. Маштабныя спаборніцтвы сабралі больш як 3 тысячы спартсменаў з 59 краін свету.**

Праграма Сусветнай летняй гімназіяды ўключае 18 відаў спорту, Беларусь на спаборніцтвах прадстаўлялі 42 школьнікі-спартсмены ў 7 відах спорту. Трэба адзначыць, што беларуская зборная ўдзельнічала ў летняй гімназіядзе ўжо трэці раз. І калі на першай мы выйгралі толькі 4 медалі, на другой — 14, то зараз — 24: 5 залатых, 7 сярэбраных і 12 бронзавых.

Залатыя ўзнагароды беларускія спартсмены заваявалі ў мастацкай гімнастыцы ў групавым мнагабор'і, у лёгкай атлетыцы (кіданне молата — Кацярына Гражэўская), у плаванні (Іван Шамшурын — на дыстанцыі 50 метраў батэрфляем, і Анастасія Васкевіч — на дыстанцыі 200 метраў комплексным плаваннем) і ў жаночай барацьбе (Алеся Гетманава). Акрамя гэтага, падчас гімназіяды былі ўстаноўлены тры рэкорды Беларусі: два ў плаванні і адзін — у лёгкай атлетыцы.

— Усё сведчыць аб тым, што ўзровень правядзення Сусветнай гімназіяды з кожным годам расце, — падвёў вынікі спаборніцтваў **кіраўнік спартыўнай дэлегацыі, дырэктар Рэспубліканскага цэнтра фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў Віталь СТРЫГЕЛЬСКІ.** — У ёй удзельнічае ўсё больш выдатных спартсменаў з розных краін. І нашы хлопцы і дзяўчаты, магчыма, хутка сустрэнуцца з імі на чэмпіянатах свету і Еўропы

## Класныя навіны

### Самы папулярны напрамак — біялогія

**У Ліцэі БДУ распачалася ўступная кампанія. Усяго было пададзена 1558 заяў. Найбольшая колькасць (359) — у біялагічныя класы, дзе конкурс склаў 9,3 чалавека на месца.**

На месцы ў матэматычных класах прэтэндуюць 297 абітурыентаў (конкурс — 7,5 чалавека на месца), у фізічных — 250 (конкурс — 6,2), інфармацыйна-матэматычным — 161, гісторыка-грамадазнаўчых — 137, філалагічным (англійская мова) — 140, хімічным — 130, філалагічным (руская мова) — 84. Такім чынам, агульны конкурс па ліцэі склаў 6,6 чалавека на месца.

З агульнай колькасці абітурыентаў 31 чалавек будзе залічаны без экзаменаў. Гэта пераможцы заключнага этапу рэспубліканскіх алімпіяд (уладальнікі дыпломаў І, ІІ або ІІІ ступені) па фізіцы, матэматыцы, інфарматыцы, хіміі, біялогіі, гісторыі, грамадазнаўстве, рускай мове і літаратуры, беларускай мове і літаратуры і англійскай мове.

Залічэнне ў 10-я класы будзе ажыццяўляцца па выніках двух пісьмовых уступных іспытаў, якія пройдуць 13 і 20 мая